Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Даўгінаўская сярэдняя школа
імя У.І. Слабодчыкава ”

Літаратурнае чытанне, 3 клас
(па праграме 4 класа
1 аддзялення
для вучняў
з інтэлектуальнай недастатковасцю)

# Тэма: **Р. Ігнаценка “Ноч у зімовым лесе”**

Настаўнік-дэфектолаг
Н.А.Цімашчук

Літаратурнае чытанне, 3 клас
(па праграме 4 класа 1 аддзялення для дзяцей з інтэлектуальнай недастатковасцю)

**Тэма:** Р. Ігнаценка "Ноч у зімовым лесе"

**Задачы:** фарміраваць уменне асэнсавана чытаць цэлымі словамі, перадаючы пры чытанні настрой твора;

развіваць аналітычнае мысленне і звязнае маўленне шляхам пабудавання поўных адказаў на пытанні;

выхоўваць уменне любавацца прыродай і бачыць у кожнай пары года сваё непаўторнае хараство.

**Ход.**

1. Арганізацыйны момант. Псіхалагічны настрой на работу

Празвінеў ужо званок.

Нас паклікаў на ўрок.

Пачынаем працаваць.

Твор мастацкі вывучаць.

- Калі ласка паглядзі на мяне, усміхніся, пакладзі сваю ўсмешку на далонькі і перадай прывітанне і добры настрой усім прысутным.

2. Праверка дамашняга задання.
   Выразнае чытанне верша Мікалая Котава "Верабей"

3. Маўленчая размінка
   Работа над выразным чытаннем верша. (Запісаны на дошцы)

- Чытанне верша настаўнікам;
- Гутарка па зместу верша.
  - Што робіць снежань?
  - Снежань, не гледзячы на вецер, церусіць сняжынкамі і пакрывае снегам зямлю?
  - Што робіць студзень?
  - Як ты разумеш слова "студзіць"?
  - Як ты разумееш выраз "буры будзіць"?
  - Растлумач выраз "Люты сцюжамі лютуе"?
  - Якім чынам ён снягі вартуе?
  - Які настрой у цябе выклікаў верш?

- Харавое чытанне верша настаўнікам і вучнем
- Жужжачае чытанне верша вучнем.
- Выразнае чытанне верша настаўнікам.

*Снежань снежыць –*
*Вецер смешыць.*
*Студзень студзіць –*
*Буры будзіць.*
*Люты сцюжамі лютуе –*
*Ад вясны снягі вартуе.*

Давай яшчэ раз паўторым назвы зімовых месяцаў. (на дошку прымацаваць)
А ты любіш зіму? А як ты думаеш, ці любяць зіму жывёлы і птушкі?

4. <u>Уступная гутарка да новага твора.</u>
Чытанне верша
*Снег на полі,*
*Лёд на рэчцы,*
*Мяцеліца гуляе –*
*Звяроў пужае.*
- Якія змены адбываюцца ў прыродзе з надыходам зімы?
- Якое надвор’е часцей за ўсё бывае зімою?
- Па якіх прыкметах ты здагадаўся, што зіма звяроў пужае?
- Што робяць зімою звяры і птушкі?

5. <u>Праца над апавяданнем Р. Ігнаценкі “Ноч у зімовым лесе”</u>
1) <u>Слоўнікавая работа</u>
Крумкачы (птушкі) – паказ малюнка на камп’ютары.
Змрок – прыцемак, цемра.
Змеркнецца – сцямнее.
Пажывіцца – падкарміцца.

2) <u>Чытанне апавядання настаўнікам.</u>

3) <u>Першасны аналіз</u>
- Якія карціны ты ўявіў падчас слухання апавядання?

- Пра якіх звяроў і птушак мы прачыталі ў апавяланні? (Вавёрка, дзяцел, сініца, крумкач, заяц, казулі, лісы, дзікі, воўк)
- Які настрой у цябе выклікала гэта апавяданне?

4) Падрыхтоўка да чытання апавядання ўголас

Практыкаванні, накіраваныя на рэгуляванне дыхання:

- “Задуй свечку” (трымаем у руках свечку, набіраем паветра ў лёгкія, а зараз хуценька падуем на свечку)
- “Торт імянінніка” А зараз пойдзем на дзень нараджэння да сябра, а ў яго вялікі торт, а на ім многа свечак і сябар просіць дапамагчы задуць свечкі. калі ласка, набяры многа паветра і пастарайся кароткімі выдыхамі задуць як можна больш свечак.
- “Надаедлівы камар”

Калі ласка, устань. Пакажыце як лятае камар. Адначасова з ўзмахамі крылаў вымаўляем гук “з-з-з-з”, а зараз акуратненька зловім надаедлівага камара. А ён зноў звініць, зноў ловім. (4 – 5 разоў)

Практыкаванні на пераадольванне цяжкасцей пры чытанні *(на дошцы)*

Ноч-чу
Ста-ран-на
Змер-кнец-ца
Па-жы-віц-ца
Па-ля-ван-не
Стрэл

5) Самастойнае чытанне апавядання (напаўголаса)

Заданне: знайсці адказ на пытанне – як праводзіць зімовую ноч вавёрка?
(паказ слайда)

6) Аналіз апавядання

- Дзе начуюць дзятлы і сініцы? (паказ слайда)
- А дзе спяць чорныя крумкачы? (паказ слайда)
- А што робіць ноччу зайчык?
- Назаві, якія яшчэ звяры не спяць ноччу?
- Як ты разумееш словы чуйна спяць звяры і птушкі?

**Фізкультхвілінка**

Выкананне імітацыйных рухаў да верша **В. Лукшы “Азбука на снезе”** с. 23 – 24

- А зараз давай разам паглядзім удалеч. Можа ўбачым якіх-небудзь жывёл ці птушак, якія шукаць сабе ежу.

7) <u>Работа над выразным чытаннем апавядання.</u>
- Практыкаванне “Буксір” Сумеснае чытанне апавядання вучня з настаўнікам.
- Гульня “Ланцужок” чытанне апявядання ланцужком па сказам сумесна з настаўнікам.
- Гульня “Рэдактар”. Сумесна з настаўнікам чытанне апавядання з выпраўленнем памылак.

**6.** <u>Дамашняе заданне</u>

С. 20 – 21, выразна чытаць і пераказваць

**7.** <u>Рэфлексія “Крыжаванка”</u>

1. Танканогая дзікая жывёла падобная да свойскай казы. (казуля)
2. Месца зімоўкі вавёркі (гняздо)
3. Маленькая птушачка ў чырвоным капялюшыку, якая робіць гнёзды ў ствалах дрэў. (дзяцел)
4. Домік, які робіць дзяцел для іншых птушак. (дупло)
5. Жаўтагрудая зімуючая птушка. (сінічка)
6. Вялікія дзікія жывёлы, занесеныя ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь (зубры)
7. Маленькі шустранькі звярок  
   Скача з сучка на сучок,  
   Рыжым хвосцікам махае,  
   Багатые запасы мае. (Вавёрка)

На што падобна наша крыжаванка? (на кармушку для дзікіх жывёл – ласёў).

Што патрэбна класці ласям у кармушку? (Сена)

Зараз ты намалюеш столькі “сена” , колькі ты маеш ведаў па прадмеце “Літаратурнае чытанне”

“Крыжаванка”

1. Танканогая дзікая жывёла падобная да свойскай казы.

2. Месца зімоўкі вавёркі

3. Маленькая птушачка ў чырвоным капялюшыку, якая робіць гнёзды ў ствалах дрэў.

4. Домік, які робіць дзяцел для іншых птушак.

5. Жаўтагрудая зімуючая птушка.

6. Вялікія дзікія жывёлы, занесеныя ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь

7. Маленькі шустранькі звярок
   Скача з сучка на сучок,
   Рыжым хвосцікам махае,
   Багатые запасы мае.

КАЗУЛЯ

ЛІСА

ЛОСЬ

ДЗІК

ВОЎК

ЗУБР

ЗАЯЦ

МЯДЗВЕДЗЬ

ВАВЁРКА

Ноч-чу
Ста-ран-на
Змер-кнец-ца
Па-жы-віц-ца
Па-ля-ван-не
Стрэл